*Алена Хмелянок*

# ПРЫРОДА Ў ФАРМІРАВАННІ БЕЛАРУСКАГА ЭТНАСУ

На фарміраванне этнасу ўплываюць шматлікія фактары: традыцыйная культурна, геапалітыка, гаспадарчая дзейнасць, прыроднае асяроддзе, канфесійныя адносіны.

У пачатку XIX стагоддзя каля 10 % усяго насельніцтва Беларусі жыло ў гарадах ці мястэчках [4, с. 81]. Этнічных беларусаў сярод іх было толькі 2 %. Таму неабходна звярнуць увагу на месца прыроды ў фарміраванні менталітэту беларускага этнасу.

Ролю прыродна-ландшафтных фактараў у працэсах этнагенезу падкрэсліваў вядомы рускі этнаграф і філосаф Л. М. Гумілеў. На яго думку, менавіта ён «кормящий ландшафт» з'яўляецца найбольш важнай і неабходнай умовай этнагенезу. Ландшафт – гэта «кавалак зямлі, якасна адметны ад іншых, які мае свае натуральныя межы і з'яўляецца цэласнай і ўзаемаабумоўленай сукупнасцю прадметаў і з'яў, якія тыпова адлюстраваныя на значнай прасторы і непарыўна звязаныя ва ўсіх адносінах з ландшафтнай абалонкай» [2, с. 19].

У. І. Вярнадскі вытокі этнасу бачыў у біясферы, у з'явах ваганняў ці флуктуацях біяхімічнай энергіі жывога рэчыва, нявызначаннасці і варыятыўнасці яго развіцця. Менавіта гэтая энергетычная напружнасць ці пасіянарнасць (Л. М. Гумілёў), сканцэнтраваная ў псіхіцы людзей, стварае адметныя этнічныя супольнасці.

Беларуская прырода не з'яўляецца вельмі добрай для земляробства. У еўрапейскай класіфікацыі гападарчых зон наша тэрыторыя пазначана нават як умоўна прыдатная для сельскай гаспадаркі. Шматлікія лясы вясной могуць паратварацца ў бясконцыя балоты калі знаходзяцца на берагах рэк ці азёр. Забалочаныя тэрыторыі, якія пераходзяць ў пясчаныя і супясчаныя глебы. Некранутая першародная прырода, пры ўсёй яе прыгажосці, усё ж такі не вельмі спрые этнасу ў гаспадарчай дзейнасці, але стымулюе творчасць разнастайных формаў фальклору, асабліва каляндарна-абрадавага кірунку. І менавіта гэтая акалічнасць і паўплавала на фарміраванне асцярожнага і павольнага беларускага чалавека.

Не вельмі плодны «кармяшчы ландшафт» таксама шмат ўплыву аказваў і на развіццё працавітасці і талерантнасці беларусаў. У кнізе «Жывапісная Расія» вельмі дакладна былі ахарактарызаваныя адметнасці беларускага менталітэту. Там адзначаецца, што беларус самы працавіты чалавек, якога асаблівасці навакольнага асяроддзя навучылі бяспрыкладнаму цярпенню і бязмежнай падрыхтаванасці да любой працы [3, с. 449]. Далей у тэксце падкрэсліваецца, што «як толькі заканчваюцца ўрадлівыя землі, адразу пачынаецца жыллё беларусаў з усіх бакоў белага свету без выключэння. Як толькі скончыліся гэтыя самотныя, наўмысна абягаючыя адно аднаго жыллё, каб не пацясніць і не пакрыўдзіць бліжэйшага суседа, пачынаюцца вёскі народу, у якога разумовыя здольнасці да таго жывыя і выдасканаленыя, што зарыентаваныя на духоўныя прадметы і пытанні веравызнання» [3, с. 456].

Высокі анталагічны і фенаменалагічны статус роднай зямлі не змагло змяніць прыняцце хрысціянскай канфесіі ў X стагоддзі. Хрысціянства прыйшло на падрыхтаваную зямлю, бо шматлікія беларускія павер'і і абрады былы вельмі падобныя да класічнай біблейскай традыцыі.

Беларусы першапачаткова былі падпардкаваныя прыродна-ландшафтным асаблівасцям, яны не змаглі адразу пакінуць свае традыцыйныя вераванні, якія захаваліся і да нашых дзён у вуснай народнай спадчыне, сваіх язычніцкіх багоў. Як адзначыў выдатны беларускі даследчык І. Абдзіраловіч, беларускі народ «страціўшы ў сябе вольнага паганца, што маліўся пню, зліваўся духам з вялікімі сіламі зямлі, тыя прыгожыя песні, сустракаючы вяснянкамі вясну або хаваючы купалу, што мог вольна адапавядаць і вольнаму подыху ветру і руху свае душы, - страціўшы ўсё гэта, беларус не ўбачыў нічога прынаднага ў новым светапоглядзе» [1, с. 11].

У беларускай культуры назіраецца вельмі цікавы сінтэз традыцыйных вераванняў і новага светапогляду. З прыняццем і распаўсюджваннем хрысціянства (пераважна Візантыйскага кірунку) традыцыйныя прыродна-стыхійныя боствы былі заменены хрысціянскімі святымі, якіям былі даручаны і асноўныя гаспадарчыя функцыі. Такое светапоглядное адзінства, а таксама ўзаемаадносіны чалавека і прыроды найбольш яскрава адлюстраваны ў каляндарна-абрадавым фальклоры, значнае месца ў якім адводзіцца апісанню навакольнага асяроддзя і стуктураванню прасторава-часовага універсума архаічнага чалавека.

Земляробчыя календары не толькі раскрываюць магію пораў году, але і суадносяць прыродныя змены з настроем і пачуццямі самаго чалавека. Прырода ў светапоглядзе старажытных сялян суадносіцца са светам продкаў, якія, на іх думку, аказвалі моцны ўплыў на жыццё грамадства. Гэта абумовіла наданне натуральным ландшафтам сімвалічнага сэнсу. Таму ў народных міфах, легендах і паданнях шмат вобразаў, у якіх адлюстравана адзінства лёсу чалавека і прыроды.

Беларускі фальклор таксама можна разглядаць як крыніцу пазнання дынамікі псіхалагічнай складовай этнасу, унутранага свету кожнага яго прадстаўніка. Кароткія замалёўкі і асобныя рысы, якія раскрываюць багацце прыроды і яе рэгіянальныя адметнасці, суадносяцца з эмацыйным, духоўным светам чалавека. Фальклорная традыцыя ўяўляе сабой своеасаблівую споведзь этнасу, дзе дасягаецца рэдкая арганічная гармонія паміж чалавекам, грамадствам і акаляючым асяроддзем, а чалавечы настрой і яго ўнутраны стан адлюстроўваюць усе працэсы ў экасістэме.

Вельмі часта ў фальклоры чалавек размаўляе з акаляючай яго прыродай. Ён просіць дапамогі ці парады, бо хвалюецца за сваю будучыню, напрыклад: «– Вясна красна й, красна, // Што ж ты нам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прынесла?»; «Да начуй, Купала, ты ў жыце, жыце, // Каб туды змяя не залятала, // У жыцечку спору не збірала».

Народны каляндар з дапамогай шматлікіх яскравых вобразаў гаспадарчых святаў дазваляў вывучаць не толькі рэальныя прыкметы кожнай пары года, але ў паэтычным выглядзе захаваў у свядомасці этнасу асноўныя віды гаспадарчай дзейнасці і іх спецыфіку. У адрадавым цыкле жыццё беларуса арганічна звязана з біярытмамі мікраландшафтнага рэгіёна.

У каляндарна-абрадавым фальклору існуюць тры семантычныя ўзроўні. Першы – змястоўны аспект, у аснове якога знаходзяцца міфалагічныя ўяўленні аб сістэме прыроднага светапарадку і яго суаднесенасці з іншым светам. Да яго прымыкае прадуцыруючая магія як сродак атрымання жаданага выніку ў гаспадарчай дзейнасці, а таксама і дэманалагічны кампанент, які вызначае гадавы расклад каляндарных святаў і акцэнтуе ролю ахоўных рытуалаў. Менавіта гэта як бы дапамагае захаваць моц першапачатковай жыццёвай (пасіянарнай) энергіі этнасу.

Прыродны ландшафт Беларусі, асабліва Палескага рэгіёну, з яго непраходнымі гушчарамі і балотамі, доўгі час засцерагаў беларускую зямлю ад дэструктыўных уплываў. Развіццё земляробчых практык
і назапашванне эмпірычнага вопыту абумовілі станаўленне сістэмы экалагічных уяўленняў, якія адлюстроўвалі ўзаемадачыненні беларусаў з навакольным асяроддзем у двух аспектах: «чалавек-прырода» і «чалавек-грамадства».

Нна пачатковых этапах цывілізацыйнага развіцця этнасу ў фальклоры сфарміравалася і зафіксавалася іерархія прыродазнаўчых каштоўнасцяў. Гэтая іерархічная структура апісвала ўзаемаадносіны паміж асобай, грамадствам і прыродай. На глыбінным ўзроўні этнічнай свядомасці з’явілася пачуццё адказнасці за стан прыроднага асяроддзя за лёс наступных пакаленняў. У семантычным плане архаічнае мысленне ўспрымала прыроду як першаснае боства, таму ўсё, што было звязанае з навакольным асяроддзем сакралізавалася. Высокі статус роднай зямлі і асаблівасці прыродна-ландшафтнай арганізацыі і абумовілі своеасаблівыя адметнасці (ментальныя маркёры) беларускага этнасу.

**Спіс літаратуры:**


1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам : Даследзіны беларускага светапогляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.
2. Гумилев, Л. Н. Этногенез и биосфера Земли / Л.Н. Гумилев. – Москва : Рольф, 2001. – 557 с.
3. Живописная Россия : Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экологическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье. – Минск : БелЭн, 1993. – 550 с. : ил.
4. Кириенко, В.В. Белорусская ментальность: истоки, современность, перспективы / В.В. Кириенко. – Гомель : ГГТУ им. П.О. Сухого, 2009. – 319 с. : ил., 2 карты.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ